РФ лишение свободы не предусмотрено вообще), а вот квалифицирующие составы надругательства одинаково строго наказуемы и в России, и в Беларуси – до пяти лет лишения свободы.

Таким образом, несмотря на большую схожесть правовой регламентации уголовной ответственности за надругательство над трупом или могилой, УК РФ и УК Беларуси имеют много различий, что предоставляет возможность и российскому, и белорусскому законодателям перенять друг у друга наиболее оптимальные элементы правовых норм.

***Сяроў Ю. А.***

## ЭВАЛЮЦЫЯ РАЗВІЦЦЯ ВІДАЎ ВЫЗВАЛЕННЯ АД КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ Ў КРЫМІНАЛЬНЫМ ПРАВЕ БССР

*Сяроў Юрый Аляксандравіч, студэнт 3 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, jurij.al@outlook.com*

*Навуковы кіраўнік: канд. юрыд. навук, дацэнт Шыдлоўскі А. В.*

Інстытуту вызвалення ад крымінальнай адказнасці прысвечаны шэраг навуковых прац. У той жа час відавочнай з’яўляецца праблема недастатковага ўзроўню даследаванасці адпаведных норм беларускімі аўтарамі. Не застаецца выключэннем і даволі значны гісторыка-прававы аспект. Намі ставіцца мэта па даследаванні відаў вызвалення ад крымінальнай адказнасці ў перыяд савецкай дзяржаўнасці Беларусі, на які прыпадае мацнейшы імпульс для развіцця дадзенага інстытуту.

На наш погляд, рацыянальным з’яўляецца ўвядзенне перыядызацыі развіцця відаў вызвалення ад крымінальнай адказнасці ў савецкім крымінальным праве Беларусі па адпаведных этапах.

1. Першы этап: 1919–1928 гг. У гэты час на нашу тэрыторыю распаўсюджваюцца падыходы, рэалізаваныя ў заканадаўстве Савецкай Расіі, якія ў першую чаргу прадугледжвалі магчымасць вызвалення ад крымінальнай адказнасці па спецыяльных складах злачынстваў. Такія злачынствы часцей за ўсё прызнаваліся «контррэвалюцыйнымі». У першых савецкіх дэкрэтах рэгламентуюцца пытанні непрыцягнення да адказнасці, а таксама вызвалення асобы ад пакарання па справах аб дэзерцірстве, хабарніцтве, удзеле ў контррэвалюцыйных фарміраваннях і інш. пры ўмове апавяшчэння аб гэтым ў пэўны тэрмін органаў улады.

У якасці дакумента, які ўтрымліваў першую ў гісторыі крымінальнага права Беларусі згадку тэрміна «вызваленне ад крымінальнай адказнасці» прызнаюць Дэкрэт СНК ад 17 студзеня 1921 г. «Аб парадку рэквізіцыі і канфіскацыі маёмасці прыватных асоб». Заўвагай да п. 10 прадугледжвалася магчымасць вызвалення ад адказнасці за захоўванне пры адсутнасці належнага дазволу зброі, выбуховых рэчываў, вайсковага рыштунку, лятальных апаратаў, тэлеграфнай і радыётэлеграфнай маёмасці, ануляваных каштоўных папер,

аўтамабіляў і матацыклетак. У Крымінальным кодэксе РСФСР 1922 г. (з 1924 г. – Крымінальны кодэкс БССР), якім кіраваліся беларускія судовыя органы, упершыню ў савецкім крымінальным заканадаўстве былі прадугледжаны тэрміны даўнасці, па заканчэнні якіх не ўжывалася пакаранне. Ужо пазней у крымінальны закон быў дададзены арт. 114а, паводле якога замацоўваліся ўмовы вызвалення ад пакарання пры здзяйсненні некаторых злачынстваў, звязаных з хабарніцтвам.

2. Другі этап: 1928–1960 гг. Наступны этап развіцця нашага пытання непасрэдна звязаны з прыняццем першага Крымінальнага кодэкса БССР у 1928 г. Дакумент фактычна захаваў ранейшыя віды вызвалення ад крымінальнай адказнасці, але ўтрымліваў іншую тэрміналогію. Артыкул 16 прадугледжваў, што крымінальны пераслед можа не ўзбуждацца за тэрмінам даўнасці, а заўвагай да арт. 208 усталеўвалася магчымасць непрыцягнення да адказнасці асоб, якія далі хабар, або былі пасярэднікамі пры дачы хабару.

У перыяд ваенна-рэпрэсіўнай напружанасці вызваленне ад крымінальнай адказнасці пачынае зноў дадаткова рэгламентавацца асобнымі прававымі актамі. У 1937 г., згодна сакрэтнаму загаду, вызваляюцца ад крымінальнай адказнасці вайскоўцы, удзельнікі контррэвалюцыйных і шкодніцкіх фашысцкіх арганізацый, пры ўмове, што яны пакаяліся ў сваіх злачынствах, добраахвотна з’явіліся і без утойвання распавялі аб ўсім учыненым і сваіх саўдзельніках. У ваенны і пастваенны час падобныя нормы прымяняліся ў дачыненні да ўладальнікаў трафейнай зброі і ўдзельнікаў калабарацыяністскіх фарміраванняў.

3. Трэці этап: 1960–1991 гг. У 1960 г. быў прыняты новы Крымінальны кодэкс БССР. Упершыню паняцце вызвалення ад крымінальнай адказнасці было замацавана ў назвах канкрэтных артыкулаў крымінальнага закона Беларусі і аддзелена ад інстытуту вызвалення ад пакарання. Глава 4 КК 1960 г.«Аб прызначэнні пакарання і аб вызваленні ад пакарання» ўтрымлівала нормы аб наступных агульных падставах для вызвалення асобы ад крымінальнай адказнасці: даўнасць прыцягнення да крымінальнай адказнасці (арт. 46); змена абставін, пры якіх дзеянне ці сама асоба да моманту расследавання ці разгляду справы ў судзе перасталі быць грамадска небяспечнымі (ч. 1 арт. 48); прыцягненне асобы да адміністрацыйнай адказнасці (арт. 48-1); перадача справы ў таварыскі суд (арт. 49); перадача вінаватага на парукі (арт. 50).

КК БССР 1960 г. утрымліваў таксама шырокі спектр норм аб спецыяльных відах вызвалення ад крымінальнай адказнасці. Да моманту абвяшчэння рэспублікай суверэнітэту законам замацоўваліся наступныя нормы: прадугледжвалася вызваленне ад крымінальнай адказнасці асобы, якая добраахвотна заявіла пра сваю сувязь з замежнай разведкай (ч. 2 арт. 61); асобы, якая добраахвотна заявіла аб падрыхтоўцы змовы з мэтай захопу дзяржаўнай улады органам улады і актыўна садзейнічала яго раскрыццю (ч. 4 арт. 61-1); асобы, якая своечасова папярэдзіла дзяржаўныя органы аб падрыхтоўцы здзяйснення выбуху, падпалу, іншых дзеянняў, якія пасягаюць на грамадскую

бяспеку ці іншым чынам садзейнічала яго перадухіленню (ч. 4 арт. 65-1.); пры вымагальніцтве хабару або асобы, якая добраахвотна заявіла аб дачы хабару (ч. 3 арт. 170); асобы, якая добраахвотна здала агнястрэльную зброю, боепрыпасы ці выбуховыя рэчывы (ч. 2 арт. 213); асобы, якая добраахвотна здала наркатычныя сродкі, добраахвотна звярнулася ў медыцынскую ўстанову за аказаннем медыцынскай дапамогі ў сувязі са спажываннем наркатычных сродкаў у немедыцынскіх мэтах (заўв. да арт. 219-1). Рэгламентавалася таксама вызваленне ад крымінальнай адказнасці з прымяненнем правілаў Дысцыплінарнага статута асобы, якая ўчыніла злачынства, прадугледжанае главой 16 «Вайсковыя злачынствы» пры змякчальных абставінах (ч. 6 арт. 226).

Падводзячы вынік аналізу развіцця пытання аб відах вызвалення ад крымінальнай адказнасці ў крымінальным праве БССР, неабходна асабліва падкрэсліць, што, акрамя прыведзеных аспектаў, шырокае выкарыстанне атрымалі нормы аб амністыі, а таксама аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці непаўнагадовых.

Такім чынам, нормы аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці прайшлі ў перыяд савецкай дзяржаўнасці Беларусі даволі сур'ёзны шлях, што дазволіла сфарміраваць паўнавартасны самастойны крымінальна-прававы інстытут у сучасным заканадаўстве. Менавіта ў гэты перыяд заканадаўцам пастунова размяжоўваецца вызваленне ад крымінальнага пакарання і вызваленне ад крымінальнай адказнасці. У сваю чаргу вызваленне ад крымінальнай адказнасці набывае шырокую дыферэнцыяцыю па агульных і спецыяльных відах, якія не губляюць актуальнасць і на сённяшні дзень.

***Филипцова П. А.***

## КРАЙНЯЯ НЕОБХОДИМОСТЬ: СОВРЕМЕННЫЕ ПРОБЛЕМЫ В УГОЛОВНО-ПРАВОВОМ РЕГУЛИРОВАНИИ

*Филипцова Полина Александровна, студентка 2 курса Белорусского государственного университета, г. Минск, Беларусь, filiptsova.polina@mail.ru*

*Научный руководитель: д-р юрид. наук, профессор Савенок А. Л.*

Согласно Уголовному кодексу Республики Беларусь (далее – УК), одним из обстоятельств, исключающих преступность деяния, является крайняя необходимость. В ч. 1 ст. 36 УК закреплено, что «не является преступлением действие, совершенное в состоянии крайней необходимости, то есть для предотвращения или устранения опасности, непосредственно угрожающей личности, правам и законным интересам данного лица или других лиц, интересам общества или государства, если эта опасность при данных обстоятельствах не могла быть устранена другими средствами и если причиненный вред является менее значительным, чем предотвращенный».

Как можно заметить, круг правоохраняемых интересов, которым может угрожать опасность для возникновения состояния крайней необходимости,